ростам беспрацоўя, падзеннем заробку і курса акцый.

**Асаблівасці эканамічнага крызісу**

1. Глыбіня крызісу: значнае скарачэнне вытворчасці, рэзкі рост беспрацоўя.

2. Маштаб: крызіс меў глабальны характар.

3. Працягласць: пачаўся ў 1929 г., працягваўся да 1932 г.

**Рыначная эканоміка развіваецца цыклічна:** пад'ём → спад → крызіс → ажыўленне → пад'ём.

**Уплыў Першай сусветнай вайны:** залежнасць сусветнай эканомікі ад стабільнасці амерыканскай.

**Крызіс перавытворчасці:** 20-я гг. — пераход амерыканскай вытворчасці на тэхналогіі масавай вытворчасці. Нізкі ўзровень спажывання. Нераўнамернае размеркаванне нацыянальнага даходу.

**Біржавы крызіс:** 1929 г. — рэзкае падзенне курса каштоўных папер.

**Фінансавы крызіс:** скарачэнне падаткавых паступленняў, бюджэтны дэфіцыт.

# ДРУГОЕ АБВЯШЧЭННЕ ССРБ

*Алена Макуцэвіч*

**Мэта і задачы:** вызначыць і ахарактарызаваць умовы абвяшчэння ССРБ, значэнне Рыжскага мірнага дагавора для беларускіх зямель; садзейнічаць развіццю ў вучняў умення працаваць з картай, табліцамі, схемамі; тлумачыць прычынна-выніковыя сувязі; выхоўваць пачуццё любві і клопату за лёс сваёй Бацькаўшчыны.

**Тып урока:** камбінаваны.

**Паняцці ўрока:** *дзяржава, інтэрвенцыя, нацыя, нацыянальны рух, Рыжскі мірны дагавор.*

**Забеспячэнне ўрока:** Гісторыя Беларусі 1917—1945 гг. : вучэб. дапам. для 9-га кл. / У. Н. Сідарцоў, С. В. Паноў; пад рэд. М. С. Сташкевіча. — Мінск : ВЦ БДУ, 2006; Гісторыя Беларусі (вызначэнні, табліцы, схемы, лічбы, даты) : дапам. для вучняў базавай і сярэдняй шк. / І. М. Кузняцоў. — Мінск : Радыёла-плюс, 2006; Фарміраванне беларускай дзяржаўнасці (насценная карта, дыдактычны матэрыял).

**Метады навучання:** рэпрадуктыўныя (уступнае слова настаўніка), часткова-пошукавыя (самастойная работа ў групах с пазнавальным матэрыялам, гістарычнымі дакументамі, тэкстам падручніка).

**Пытанні ўрока**

1. Дзеянні Чырвонай арміі.
2. Гістарычныя ўмовы II абвяшчэння ССРБ.
3. Устанаўленне савецкай улады.
4. Умовы Рыжскага мірнага дагавора.
5. Вынікі і значэнне вайны з Польшчай для Беларусі.

**Ход урока**

***I. Арганізацыйны момант. Знаёмства вучняў з планам урока, стварэнне псіхаэмацыянальнай атмасферы.***

Размінка. Гульня «Асацыяцыі» (вучні атрымліваюць мячык па чарзе; той, хто кідае, называе сваё паняцце па тэме «Барацьба беларускага народа супраць польскай інтэрвенцыі», а той, хто атрымлівае, называе сваю асацыяцыю).

***II. Праверка дамашняга задання. Праца з пытаннямі на с. 46, табліцамі «Ланцужок пытанняў».***

| | | |
|---|---|---|
| 3 сакавіка 1918 г. | Абвяшчэнне ЛітБел ССР | Падзел тэрыторыі Беларусі |
| 1 студзеня 1919 г. | Дата нараджэння А. Р. Чарвякова | Увядзенне харчразвёрсткі |
| 1892 г. | Брэст-Літоўскі мірны дагавор | Абвяшчэнне савецкай улады |
| 2—3 лютага 1919 г. | ПВК | Народны камісар асветы, старшыня Народных Камісараў ССРБ |
| 1918 г. | Маніфест Часовага рабоча-сялянскага савецкага ўрада | Утварэнне буфернай дзяржавы |

*Вучні выконваюць заданне ў групах.*

***III. Тлумачэнне новай тэмы.***

**Настаўнік.** У сакавіку 1920 г. польскія войскі пачалі новае наступленне. З дапамогай Антанты яны захапілі Мазыр, Калінкавічы, Рэчыцу (пакажыце на карце). 25 красавіка палякі сумесна з пятлюраўцамі разгарнулі наступленне на працягу ўсяго польска-савецкага фронту ад р. Прыпяць да р. Днестр. Дзякуючы перамяшчэнню войскаў з Усходняга фронту, Чырвоная армія 14 мая 1920 г. здолела перайсці ў контрнаступленне. Але з-за недахопу сіл яно не дало вынікаў. Новае наступленне Чырвоная армія пачала ў ліпені 1920 г. Яно было старанна падрыхтавана і дало плён. 7 ліпеня быў вызвалены Мінск, а 1 жніўня — Брэст. Савецкія войскі рушылі далей на захад. На чале з М. М. Тухачэўскім яны дайшлі да Варшавы, але з-за недахопу сіл вымушаны былі вярнуцца назад. Пад пагрозай акружэння яны пакінулі тэрыторыю Заходняй Беларусі.

**Праблемнае пытанне:** вайну 1919 г. можна расцаніць як інтэрвенцыю Польшчы супраць Савецкай Расіі. Як, на вашу думку, можна расцаніць наступленне Чырвонай арміі на Варшаву? **(Імкненне распаўсюдзіць пралетарскую рэвалюцыю.)**

*Фізкультхвілінка.*

**Настаўнік.** Пад націскам А. Чарвякова, З. Жылуновіча, Д. Чарнушэвіча ЦК КП(б)Б прызнаў неабходным выступіць з дэкларацыяй аб прызнанні самавызначэння беларускага народа. 31 ліпеня 1920 г. у Мінску была прынята Дэкларацыя незалежнасці БССР у межах адной (Мінскай) губерні. Гэта было не столькі аднаўленне беларускай дзяржавы, колькі супакойванне народных мас. Супраць гэтага акта выступілі беларускія эсэры, якія жадалі бачыць Беларусь цэласнай і незалежнай дзяржавай.

*Праца з дакументам «Вытрымкі з Дэкларацыі аб абвяшчэнні незалежнасці ССРБ ад 31 ліпеня 1920 г.» **па метадзе** ключавога слова (с. 49).*

*Групавая праца з п. 2. (дыферэнцыяцыя заданняў).*

**Настаўнік.** Першай групе неабходна адказаць на пытанне «Калі і паміж якімі краінамі заключаўся дагавор?».

Пакажыце на карце тэрыторыі, якія адышлі да Польшчы. Другая група павінна запоўніць табліцу, папярэдне адзначыўшы на контурнай карце акупаваную тэрыторыю Беларусі і ССРБ.

| Дата дагавора, яго назва | Змест дагавора | Значэнне дагавора для беларускіх зямель |
|---|---|---|
| | | |

А трэцяя група павінна ўявіць сябе дэлегатамі Беларускай дзяржавы на Рыжскай канферэнцыі. Што б вы сказалі наконт зместу Рыжскага мірнага дагавора?

*Выказванні вучняў. Праца з контурнай картай (адзначыць акупаваную тэрыторыю Беларусі і ССРБ).*

***IV. Замацаванне матэрыялу.***

Настаўнік прапануе вучням назваць паняцці, якімі яны карысталіся на ўроку, і вызначыць, якія з іх былі асноўнымі, а якія — другараднымі.

***V. Дамашняе заданне: § 7, п. 1—4, с. 50.***

***VI. Рэфлексія.***

**Я засвоіў матэрыял** (*вучні падыходзяць да дошкі і насупраць выказвання, якое найбольш адпавядае засваенню імі тэмы, ставяць значок; настаўнік згодна з вынікамі робіць высновы*): а) атрымаў трывалыя веды; б) засвоіў амаль увесь матэрыял; в) засвоіў матэрыял часткова, трэба яшчэ папрацаваць.

**Яшчэ адзін варыянт рэфлексіі на ўроку:** я даведаўся...; я зразумеў, што...; я здзівіўся...; я падумаў...

*На выказванні вучняў даюцца 2—3 мінуты.*